МИНИСТЕРСТВО ОБРАЗОВАНИЯ
РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ
ПОЛЕССКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ УНИВЕРСИТЕТ

# БЕЛАРУСЬ – УКРАИНА: МНОГОВЕКТОРНЫЕ НАПРАВЛЕНИЯ РАЗВИТИЯ ТУРИЗМА В РЕГИОНАХ

Монография

Пинск
ПолесГУ
2020

УДК 338.48(476)(477)
ББК 65.43(4Беи+4Укр)
Б 43

Авторский коллектив:
Аксенчик Н.В., Андриевич А.М., Антоненко И.Я., Баев В.В., Баева О.В., Балджи М.Д., Бочило И.Г., Васильченко А.О., Гречишкина Е.А., Демьянов С.А., Еленская И.Э., Животенко А.И., Ивушкина Е.Б., Корзюк А.А., Красномовец В.А., Кушнир И.Б., Литвиненко А.В., Лозицкий В.Л., Макарушко В.В., Мигун Д.А., Микелевич Е.Б., Микитин Т.М., Морозова Н.И., Однолько В.А., Панов С.В., Радченко О.Н., Самоховец М.П., Саскевич В.В., Стрижак Е.О., Фокина-Мезенцева Е.В., Хижнякова Н.А., Цуба М.В., Чеботарев В.А., Чувак С.В., Якимчук А.Ю.

Рецензенты:
доктор экономических наук, профессор кафедры туризма
и отельно-ресторанного дела
Луцкого национального технического университета **Л.Ю. Матвийчук**;
доктор экономических наук, доцент, проректор по учебной работе,
профессор кафедры экономики и управления туристической индустрией
Белорусского государственного экономического университета
**А.И. Тарасенок**.

Утверждена Советом
УО «Полесский государственный университет» (№ 6 от 27 февраля 2020г.)

Б43 Беларусь – Украина: многовекторные направления развития туризма в регионах : монография / А.О. Васильченко [и др.]. – Пинск : ПолесГУ, 2020. – 362 с.

ISBN 978-985-516-609-3

Издание посвящено изучению проблем реализации стратегических направлений развития индустрии туризма и гостеприимства на постсоветском пространстве. Разноаспектный междисциплинарный анализ является актуальным в современных условиях развития разнообразных форм сотрудничества государств на региональном приграничном уровне.

Исследование является результатом межкафедрального и межвузовского сотрудничества учреждений высшего образования Беларуси и Украины. Материалы заинтересуют специалистов органов регионального управления и местного самоуправления, научных работников в различных междисциплинарных областях.

УДК 338.48(476)(477)
ББК 65.43(4Беи+4Укр)

ISBN 978-985-516-609-3

© УО «Полесский государственный университет, 2020»

## 4.5 Першая сусветная вайна як аб’ект турыстычнай прываблівасці

Даўно завяршылася Першая сусветная вайна. Больш чым сто гадоў назад наша зямля была распахана ўзрывамі, прарэзана шматлікамі шрамамі акопаў. Але з цягам часу яна амаль залячыла свае раны. Іх зараз цяжка знайсці пад густымі травамі. Жыццё перамагло смерць, аднак народная памяць аб тых падзеях на Беларусі жыве. Таму што беларускі народ і беларускія землі, мабыць найбольш пацярпелі ад гэтага сусветна-маштабнага канфлікту. Менавіта тут адбыўся самы вялікі прарыў Першай сусветнай вайны – Свянцянскі; Палеская аперацыя, якая спыніла далейшы рух наперад германскіх войск; Нарачанская бітва, якая ў значный ступені прадвырашыла лёс бітвы пад французскім Вердэнам; Баранавіцкая наступальная аперацыя, якая дапамагла паспяхова ажыццявіць знакаміты “Брусілаўскі прарыў” на Украіне, Крэўска–Смаргонская аперацыя,

якая істотна пасадзейнічала развіццю наступлення англа-французкіх войск пад Іпрам і г.д .

Трэба адзначыць, што пэўная работа па захаванні гісторыка-культурнай спадчыны беларусаў праводзілася непасрэдна падчас Першай сусветнай вайны. Разам з перыёдыкай, асветай і літаратурай важнае месца ў выхаванні нацыянальных пачуццяў беларусаў некаторыя беларускія грамадскія дзеячы адводзілі музейнай справе . Аб гэтым ёсць успаміны паэта Валерыя Брусава, які на пачатку вайны (жнівень 1914г.) завітаў у Вільню ў якасці ваеннага карэспандэнта на расійска – германскім фронце, дзе пазнаёміўся з беларускімі дзеячамі культуры і літаратуры. Пра свае ўражанні ён паведамляў: “Трапіў у круг беларусаў, фанатыкаў сваёй ідэі, перакананых, што беларусы – адзіныя сапраўдныя славяне. Бачыў іх паэтаў, вучоных, філолагаў і г.д.; зборы іх старыны, рукапісаў, старадрукаваных кніг (з 1491 г.), розных рэчаў,зброю і г.д.“ [1, с. 38]. Размова тут вядзецца пра пачатак стварэння музея братамі Іванам і Антонам Луцкевічамі. Да заснавання музея (1921 г.) калекцыя экспанатаў захоўвалася пры рэдакцыі газеты “Наша ніва” і з’яўлялася крыніцай вывучэння роднага краю і паэтычнага натхнення для Я. Купалы, М. Багдановіча, В. Ластоўскага, М. Гарэцкага і іншых дзеячаў беларускага руху.

Галоўным шукальнікам па збору экспанатаў і стварэнню экспазіцыі музея быў Іван Луцкевіч. Акрамя знаходак у час археалагічных раскопак, якія праводзілі ў розных кутках Беларусі Я. Тышкевіч, І. Луцкевіч, П. Церабееў, Г. Татур, папаўненне калекцыі адбывалася і іншымі шляхамі. З успамінаў вядомай дзеячкі беларускага руху Юліяны Мэнке (пасля вайны – Дубейкаўская, псеўданім – Кветка Вітан) пра Івана Луцкевіча ёсць наступнае: “Ён знаходзіў іх (экспанаты для музея) на кірмашах, на падстрэшышчах старых двароў, у букіністаў, перакупнікаў… Набываў ён іх пераважна, як безвартасныя рэчы, за грашы. Тады ён ведаў, як гэтыя рэчы адрэстаўраваць, і калі яны мелі беларускую характарыстыку – пакідаў іх у сваіх музейных зборах, калі ж гэтай характарыстыкі не малі – прадаваў за належную ім цану і гэтак здабываў сродкі на беларускую нацыянальную справу” [2, с. 44]. Аднак з набліжэннем фронту да Вільні ў 1915 г. магчымасці пошуку антыкварных рэчаў звузіліся. Становішча яшчэ больш пагоршылася ў сувязі з мабілізацыяй у армію найбольш актыўных дзеячаў беларускага нацыянальнага руху. Пасля закрыцця выдавецтва “Наша ніва”, экспанаты былі перавезены на віленскую кватэру братоў Луцкевічаў і захоўваліся тут да 1921 г.

Ёсць звесткі, што да 1915 г. праіснаваў і Гарадскі музей Мінска, які сваім з’яўленнем абавязаны “Таварыству аматараў прыродазнаўства, этнаграфіі і археалогіі”, бо аснову музейнай

экспазіцыі склалі дары менавіта гэтага таварыства мясцовай інтэлегенцыі [3] .

Вялікая грамадска-культурная праца праводзілася ў гэты час передавой беларускай інтэлегенцыяй па вывучэнні і захаванні помнікаў гісторыі і культуры. Так, у сакавіку 1916 г. у Мінску пры Цэнтральным грамадзянскім камітэце быў створаны Аддзел апекі над помнікамі мастацтва і культуры. Ініцыятарамі яго стварэння была група энтузіястаў  на чале з мастаком К. Біске, занепакоенных лёсам помнікаў гісторыі і культуры, якім у выніку вайны пагражала поўнае знішчэнне. Члены Мінскага аддзела складалі апісанне помнікаў, фатаграфавалі іх, удзельнічалі ў навуковых экспедыцыях. З асаблівай увагай адносіліся да тых аб’ектаў, якія знаходзіліся ў зоне непасрэдных баявых дзеянняў. У Мінску былі арганізаваны сховішчы, куды звозілася калекцыя твораў мастацтва, бібліятэкі, архівы. За кароткі час было сабрана каля 36000 адзінак захоўвання. Тут знаходзіліся больш за 4000 фотаздымкаў і малюнкаў помнікаў архітэктуры Беларусі і прыкладна такая ж колькасць картак з інфармацыяй аб недаследаванных аб’ектах, каля 100 планаў гарадоў і асобных збудаванняў, складзена іх апісанне. Аддзел апекі над помнікамі зафіксаваў шмат пабудоў, якія за час вайны былі знішчаны. У Мінску па ініцыятыве Аддзела ў лістападзе 1916г. праводзіліся выстаўкі, збор грошай з якіх пералічваўся ў фонд аховы помнікаў [4, с. 19].

Разам з краязнаўствам працягваліся ў гэты час этнаграфічныя даследаванні. Цікавасць да іх у першую чаргу была абумоўленна ажыўленнем нацыянальна-адраджэнскага руху на Беларусі. Менавіта гэтай акалічнасцю можна растлумачыць з’яўленне серыі этнаграфічных картаў рассялення ўсходнеславянскіх народаў  (працы Т. Фларынсага, П. Пешціча, Я. Карскага, А. Рыціха) і даследаванні аб паходжанні беларускай народнасці і яе мовы (працы Я. Карскага). Вайна перапыніла навуковую работу ў гэтай галіне, але вядома, што Е. Раманаў, А. Багдановіч і Я. Карскі ў эвакуацыі працягвалі апрацоўку раней сабраных матэрыялаў. Так, у маскоўскім выдавецтве ў 1916 г. выйшла першая кніга 3-га тома вядомай працы Я. Карскага “Беларусы” [5, с. 92].

У канцы 1915 года завяршыўся манёўраны перыяд вайны на беларускіх землях. Фронт стабілізаваўся і больш чым на два гады ўсталяваўся па лініі Дзвінск-Паставы-Баранавічы-Пінск. Наступіў пазіцыйны час вайны і войскі з абодвух бакоў пачалі замацоўвацца на апошніх занятых межах. З гэтага часу адбываецца паўсюднае будаўніцтва шматлікіх дотаў, салдацкіх зямлянак, агнявых кропак, назіральных пунктаў, траншэй, акопаў і артылерыйскіх капаніраў. Маючы даволі высокага ўзроўню матэрыяльна-тэхнічную базу,

германска-аўстрыйскія войскі ўмацоўвалі свае пазіцыі больш якасна і грунтоўна, чым гэта рабіла расійская армія, абарончая паласа якой рабілася з дрэваў і зямлі. На працягу пазіцыйнай вайны прадстаўнікі Траістага саюза на нашых землях ўзвялі вялікую колькасць жалезабетонных умацаванняў. Будаваліся моцныя жалезабятонныя бліндажы, якія атапліваліся печкамі і мелі электрычнае асвятленне. Як правіла, электрастанцыі знаходзіліся ў глыбока забітаніраваных бункерах.

Лік узведзеных аб'ектаў гэтага перыяду на нашых землях уражвае і змяраецца сотнямі. Менавіта гэта характарызуе Беларусь як краіну, у якой найбольш захавалася помнікаў, звязаных з гісторыяй Першай сусветнай вайны. Усе дадзеныя помнікі-аб'екты, якія мелі як жылое, так і гаспадарча-вытворчае прызначэнне, былі збудаваныя для патрэб арміі, пагэтаму мы іх адносім да ваеннай спадчыны.

Увогуле, да нашых дзён захавалася шмат збудаванняў з жалеза-бетона і сталі, якія працягнуліся ўздоўж амаль ўсёй лініі фронта на беларускіх землях. Большасць з якіх знаходзіцца на тэрыторыі Мядзельскага, Вілейскага, Баранавіцкага, Ляхавіцкага і Пінскага раёнаў. За выключэннем дота Малчанава, што у Пінску, ні адно з гэтых збудаванняў не выкарыстоўваецца з турыстычнай мэтанакіраванасцю. Час ад часу без ўсялякай арганізацыі стыхійна іх наведваюць адзінкавыя турысты, ды "чорныя" капацелі, і ёсць выпадкі, калі гэтыя жалезабетонныя збудаванні выкарыстоўваюцца мясцовым насельніцтвам для сваіх патрэб: складаў, пограбаў, утрымання жывёлы, бывае ў іх скідваюць смецце, некаторыя адбітыя рэшткі прымяняюць для падмурка ўласных пабудоў. У пэўных выпадках мясцовыя жыхары па-гаспадарчы выкарыстоўваюць лісты з рыфленага жалеза,што ўмацоўвалі столь германскіх бліндажоў і бункераў для аддзелкі сваіх склепаў. За перыяд ад заканчэння Першай сусветнай вайны і да нашых дзён ніякай працы па даследаванню і вывучэнню гэтай ваеннай багатай спадчыны ніхто не рабіў. Археалагічныя раскопкі на дзяржаўным узроўні не праводзіліся і гэта зразумела, таму што дагэтуль не было праведзена размініравання. Адпаведна не вывучалася інфраструктура гэтых помнікаў-аб'ектаў, фартыфікацыйная сістэма, нават не праводзіліся работы па івентарызацыі. У выніку, у больш топкіх мясцінах некаторыя доты былі ў дрыгве і праз год-другі будуць поўнасцю пад грунтам зямлі. Усе вышэй адзначанае патрабуе тэрміновых рэстаўрацыйных работ з прыцягненем дзеля дапамогі і кансультацый прадстаўніцтвы турыстычных, музейных, навуковых і вышэйшых навучальных устаноў па профілю.

Акрамя разнастайных умацаванняў прадумана будавалася дапаможная франтавая інфраструктура. Для размяшчэння шматлікіх

вайсковых фарміраванняў будаваліся казармы і баракі. Калі іх было недастаткова вайсковы кантынгент расквартыроўвалі ў вясковых хатах. Таксама будаваліся гаспадарчыя пабудовы: камандныя пункты, штабы, лазарэты, пункты харчавання, электрастанцыі, склады і г.д. Як адзін, так і другі бок вялікую ўвагу ўдзялялі аднаўленню старых дарог і будаўніцтву новых, і асабліва чыгунак у выглядзе вузкакалеек. Прычым на кожнай вузлавой станцыі ўзводзіліся вакзалы. Як правіла, дзе знаходзіліся буйныя фарміраванні германскіх войск там яшчэ будаваліся і кінатэатры. Як для германскіх, так і для расійскіх войск істотнае значэнне мелі вытворчыя збудаванні, якія ў першую чаргу прадстаўлены лесаперапрацоўчымі, абуткова-адзёжавымі, скурана-гужавымі, інвентарнымі майстэрнямі.

З аб’ектаў, якія захаваліся, можна назваць шэраг пабудоў ваенных гарадкоў, дзе размяшчалася Стаўка Вярхоўнага Галоўнакамандуючага расійскіх войск у Баранавічах і ў Магілёве, ды дом Маліна ў Мінску, дзе знаходзіўся будаўніча-тэхнічны аддзел Заходняга фронту.

Вытворчасць зброі, асабліва новых відаў узбраенняў, дасягнула неверагодных памераў. Прымяненне танкаў, падводных лодак, артылерыі, куляметаў, удушлівых газаў не толькі значна пашырыла маштабы ваенных дзеянняў, але і істотна павялічыла колькасць забітых. Адпаведна ў ваенных дзеяннях, што мелі месца ў 1915–1918 гг. на беларускіх землях прымалі ўдзел расійскія, германскія і часткова аўстра-венгерскія войскі. Як правіла, у прыфрантавой паласе загінуўшых салдат розных праціўнікаў хавалі разам. Такім чынам захавалася многа вайсковых могілак і брацкіх магіл, дзе падчас вайны ці ў хуткім часе пасля яе былі збудаваны агульныя мемарыялы і помнікі. Але былі моманты, калі пасля вялікіх баёў значную колькасць загінуўшых не паспявалі пахаваць на могілках, а проста звальвалі трупы ў ровы і засыпалі зямлёй. Пасля падпісання пакта Молатава-Рыбентропа ( 23 жніўня 1939 года) і да самага пачатку Вялікай Айчынай вайны ў месцы баёў на беларускіх землях прыязджалі прадстаўнікі ад дабрачынна-культурных германскіх арганізацый, якія мелі права бесперашкодна шукаць нямецкія пахаванні Першай сусветнай вайны. Патрэбна адзначыць, што сярод гэтых прадстаўнікоў было нямала вопытных разведчыкаў з абвера, у якіх былі зусім іншыя задачы: устанаўленне месцазнаходжання аэрадромаў, ваенных гарадкоў, ліній сувязі, мастоў і г.д. Тым не менш была праведзена істотная праца па добраўпарадкаванню магіл загінуўшых салдат з нямецкага боку. Яны раскопвалі ровы і па металічнаму медальёну вызначалі імя загінуўшага, а затым перазахоўвалі на могілках. На магілах устанаўлівалі бетонны квадрат (альбо іншай формы) з надпісам дадзенных забітага. Як правіла,

афіцэрам ставілі невялікія каменныя помнікі [6, с. 18]. Меліся рэдкія выпадкі, калі рэшткі загінуўшых па хадатайніцтву сваякоў перавозіліся ў Германію. Сёння многія з гэтых могілак параслі лесам і хмызняком. Некаторыя помнікі разбураны шукальнікамі скарбаў, хаця ніякага золата, альбо дарагіх рэчаў там не было.

Загінуўшых расійскіх салдат у 1914 – пачатку 1915 гг.(у асноўным з Польшчы і Ўсходняй Прусіі) прывозілі на нашы землі і хавалі на праваслаўных могілках. Звычайна на іх магілах ставіліся толькі крыжы, але бывала на сродкі ваеннага фонду пасярод могілак будавалі цэрквы-капліцы па ўшанаванні памяці ахвяр Першай сусветнай вайны [7, с. 25].

Значным унёскам у развіцці турыстычнай справы могуць з'яўляцца сучасныя беларускія музеі, якія тым ці іншым чынам адлюстроўваюць падзеі Першай сусветнай вайны. У гэтым плане неабходна звярнуць увагу на пакуль што адзіны музей Першай сусвестнай на беларускіх землях у в.Заброддзе (Вілейскій р-н, Мінскай вобл.). Асноўная частка экспазіцыі тут знаходзіцца ў Барыса-Глебскай капліцы. Другая частка музейнага комплекса – гэта элемент чыгункі з пяцівагонным саставам. Фактычна рэканструкцыя цягніка пад эшалон Першай сусветнай вайны, дзе кожны вагон – асобная экспазіцыя. У фондзе музея захоўваецца болей за 2000 арыгінальных экспанатаў: абмундзіраванне, зброя, працівагаз, дакументы, фатаздымкі, прадметы быта салдат і г.д.

У магілёўскім і баранавіцкім краязнаўчых музеях істотная частка экспазіцый прысвечана месцазнаходжанню ў гэтых гарадах падчас вайны Стаўкі Вярхоўнага Галоўнакамандуючага, тут таксама прадстаўлены розныя юмарыстычныя і прапагандысцкія плакаты, карты, дакументы, часопісы і іншыя рэчы ваеннага часу.

У экспазіцыі мядзельскага музея народнай славы экспаніруюцца даволі ўнікальныя ў сваім родзе прадметы: арыгінальныя армейскія пасведчанні, нямецкія акупацыйныя пашпарты, расійская і нямецкая зброя, салдацкія пісьмы, медальёны, какарды, жэтоны, нацельныя крыжыкі, шматлікія фатаздымкі, драўляная дошка знятая з ваенных могілак ў в.Вузла з надпісам: " Не шуміце вы, сосны зялёныя, не будзіце вы слаўных герояў".

Некалькі залаў, якія расказваюць наведвальнікам аб 810-ці дзённай абароне Смаргоні знаходзяцца ў краязнаўчым музеі Першай сусветнай вайны гэтага горада. У экспазіцыі музея прадстаўлены шматлікія дакументальныя матэрыялы, карты, супрацьхімічныя комплексы абароны ад газаў Зялінскага і інш.

Шмат самых розных прадметаў звязаных з ваенным ліхалеццем Першай сусветнай вайны захоўваецца ў калекцыі музея Беларускага Палесся ў г.Пінску. Тут ёсць шмат паштовак, розных дакументаў і

старых фатаздымкаў, што утрымліваюць інфармацыю аб акупіраванным Пінску, а таксама вядомых баявых аперацыях на Піншчыне.

Ва ўсіх вышэй адзначаных музеях амаль штогод ладзяцца выставы, прысвечаныя падзеям Першай сусветнай вайны.

Яшчэ адным важным аспектам папулярызацыі падзей Першай сусветнай вайны і адпаведна турыстычнай прываблівасці з'яўляецца ўзвядзенне мемарыялаў і рэканструкцый – аднаўленне ў рэальным часе фрагментаў буйных ваенных аперацый.

Пасля завяршэння Першай сусветнай вайны ў многіх германскіх, аўстрыйскіх, італьянскіх, французскіх, бельгійскіх і польскіх гарадах былі ўзведзены помнікі і мемарыялы загінуўшым у ёй вайскоўцам. Аднак на тэрыторыі былой Расійскай імперыі (якая дарэчы панесла найбольшыя страты: параненых, забітых, палонных і прапаўшых без вестак было звыш 9 млн чалавек) усе падзеі, звязаныя з царызмам, савецкія ідэолагі імкнуліся аддаць забыццю. З цягам часу, калі савецкая ідэалогія зышла з гістарычнай сцэны у мінулае, пачалося паступовае аднаўленне забытай вайны. Сёння ў такіх гарадах як Масква, Санкт-Пецярбург, Калінінград, Пскоў, Яраслаўль, Калуга, Цвер і інш. збудаваныя мемарыялы, помнікі і памятныя манументы.

Аднаўляецца памяць аб Першай сусветнай вайне і на беларускіх землях. У жніўні 2011 года на месцы былых братэрскіх могілак (пахаванні 1914–1918 гадоў) у Мінску была збудаваная мураваная капліца, выкананая ў класічным стылі, якая стала пераемніцай ранейшага драўлянага храма, узведзенага ў 1915 годзе і знесенага савецкай уладай у 1932. Тут жа, побач з капліцай, знаходзяцца бронзавыя пліты з выгравіраванымі імёнамі 2500 пахаваных вайскоўцаў.

Шэраг помнікаў і памятных знакаў, прысвечаных падзеям Першай сусветнай вайны, узведзены ў в. Баруны (Ашмянскі раён) – помнік экіпажу самалёта "Ілля Мурамец" , у в. Скробава (Баранавіцкі раён) – мемарыяльная дошка загінуўшым у Скробава-Гарадзішчанскай (Баранавіцкай) бітве, у в. Невель (Пінскі раён) капліца з мемарыяльнай дошкай у гонар вядомай Невельскай партызанскай аперацыі, а таксама памятны знак на Агінскім канале і інш.

Аднак першым агульнадзяржаўным мемарыяльным комплексам, прысвечаным подзвігу героям і ахвярам Першай сусветнай вайны, трэба лічыць Смаргонскі мемарыял. Уваход у мемарыяльны комплекс тут абазначаны Георгіеўскім крыжам. Дадзены комплекс размяшчаецца на Алеі памяці і складаецца з трох скульптурных кампазіцый: "Бежанцы" , "Салдаты Першай сусветнай вайны", "Крылаты геній салдацкай славы". Апошняя кампазіцыя сімвалізуе

вайсковую славу салдат, аддаўшых жыццё за Радзіму. На тэрыторыі комплекса пракладзены мураваныя сцяжынкі, збудавана капліца і пастаўлены “Камень памяці” з тэкставым зваротам да нашчадкаў. Побач знаходзіцца зона “Памяці і жалю”, дзе з бронзы адлітая карта ваенных дзеянняў 1915–1917 гадоў, каля яе ўсталяваны дзве мемарыяльныя ўрны з зямлёй з розных месц пахавання салдат расійскай і нямецкай армій. Мемарыялізаваныя комплексы на месцах буйных бітваў з’яўляюцца ва ўсім свеце прыцягваннем вялікай колькасці турыстаў з розных краін. Прыкладам тут могуць быць буйныя мемарыялы, звязаныя з Першай сусветнай вайной на тэрыторыі Францыі, альбо прысвечаныя іншым войнам Барадзінскае поле (Маскоўская вобл.), ці Буйніцкае поле пад Магілёвам, лінія Сталіна пад Мінскам і г.д. У дадзеным накірунку трэба пашырыць работу ў дачыненні да гераізацыі вялікіх бітваў на беларускіх землях, звязаных з Першай сусветнай вайной. У тых ці іншых мясцінах беларускай зямлі, дзе адбываліся кravaпралітныя баі, альбо нават пры музеях неабходна займацца ваенна-гістарычнай рэканструкцыяй асобных ключавых эпізодаў гэтых баёў. Бо такія фестывалі-відовішчы цікавяць, захапляюць і прыцягваюць мноства людзей.

Нажаль, краязнаўча-ваенны бок перыяда Першай сусветнай вайны вывучаны яшчэ не дасканала. Упэўнены ў тым, што далейшыя даследаванні краязнаўчай справы на беларускіх землях, звязанныя з Першай сусветнай вайной, дапамогуць раскрыць шматлікія невядомыя і малавядомыя старонкі нашай гісторыі і культуры, а таксама істотна пасадзейнічаюць турыстычнай прываблівасці.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. Казбярук, У. На хвалі беларускага адраджэння / У. Казбярук // Роднае слова. – 1993. – № 7. – С. 37–44.

2. Вітан-Дубейкаўская, Ю. Мае ўспаміны / Ю. Вітан-Дубейкаўская. – Вільня : COR ARDENS. – 1994. – 192 с.

3. Беларускі джяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва (БДАМЛіМ). – Фонд. –3. – Воп.1. – С.101. – Л. 2.

4. Дзянісаў, У. З гісторыі аховы помнікаў / У. Дзянісаў // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. – 1984. – № 3. – С.19–20.

5. Беларуская мова: Энцыкл. / Беларус. Энцыкл.; пад рэд. А.Я. Міхневіча; рэдкал.: Б.І. Сачанка (гал.рэд). – Мінск : Бел.Эн., 1994. – 655 с.

6. Семашко, В. Здесь и раньше вставала земля на дыбы / В. Семашко // Родник. – 1990. – № 5– 6. – С. 18–19.

7. Цуба, М. В. Наш край у гады Першай сусветнай вайны / М. В. Цуба // Веснік Палескага дзярнаўнага ўніверсітэта (серыя грамадскіх і гуманітарных навук). –2008. – №1. – С. 25–29.

## СОДЕРЖАНИЕ

**Введение** ........................................................................................ 5
**Раздел 1. Современное состояние и перспективы развития туристической индустрии** ....................................................................... 7
1.1. Теоретико-методические основы современной парадигмы управления качеством в сфере туризма *Антоненко И.Я., Баев В.В., Фокина-Мезенцева Е.В.* ........................................................ 7
1.2. Современные направления развития туристической индустрии в Украине *Балджи М.Д., Однолько В.А.* ........................... 19
1.3. Формирование кластерных инициатив: анализ международного опыта *Васильченко А.О.* ............................................ 32
1.4. Мониторинг туристического спроса на рынке въездного и внутреннего туризма в Республике Беларусь за 2018 год *Демьянов С.А.* ......................................................................................... 41
1.5. Екологізація туризму як складова концепції сталого розвитку *Красномовець В.А., Животенко А.І.* ................................... 54
1.6. Можливості розвитку туризму як сектора «зеленої» економіки *Хижнякова Н.О.* ............................................................... 62
**Раздел 2. Экономика и менеджмент туристической и гостиничной сфер** .......................................................................... 71
2.1. Класифікація суб`єктів ринкових відносин у сфері медичного туризму *Баєв В.В., Баєва О.В.* ............................................ 71
2.2. Потребители турпродуктов как стратегический ресурс формирования конкурентного преимущества *Ивушкина Е.Б., Кушнир И.Б.* ........................................................................................ 79
2.3. Особенности реализации мобильных приложений в отельном бизнесе в зависимости от типа рыночной структуры *Литвиненко А.В., Стрижак Е.О.* ....................................................................... 88
2.4. Проектування екологічних стежок у Рівненській області *Микитин Т.М.* ....................................................................................... 95
2.5. Финанасовые стимулы развития агроэкотуризма в Республике Беларусь *Самоховец М.П.* ................................................ 102
2.6. Финансирование устойчивого развития туризма в Республике Беларусь *Чеботарев В.А., Гречишкина Е.А.* ................... 111
2.7. Факторы развития сферы туризма в Гродненской области *Чувак С.В.* ........................................................................................ 120
**Раздел 3. Социально-философская и правовая проблематика изучения развития сферы туризма и гостеприимства**……… 130
3.1. Экологический туризм в Республике Беларусь и правовые аспекты его развития *Андриевич А.М.* ................................................. 130

3.2. Социально-государственный заказ как фактор подготовки специалистов в сфере туризма и гостеприимства в условиях цифровизации *Лозицкий В.Л.* ........................................................................ 136
3.3. Организационно-правовые формы субъектов туристической индустрии в Республике Беларусь *Макарушкоо В.В.* 143
3.4. Правовое обеспечение развития агроэкотуризма в Республике Беларусь *Саскевич В.В.* ....................................................... 165
3.5. The tourism as a component of socio-cultural development and ecological safety of the state *Yakymchuk A.* ............................................. 174
**Раздел 4. Историко-культурологический контент исследования вопросов развития регионального краеведческого и страноведческого направлений в туризме** ....... 180
4.1. Кантэнт вывучэння этнаграфічнай спадчыны беларускага Палесся ў міжваенны перыяд сродкамі фатаграфіі ў падрыхтоўцы сучасных спецыялістаў у галіне турызму і гасціннасці *Бачыла І.Г., Лазіцкі В.Л.* ........................................................................................... 180
4.2. Исследование вопросов развития регионального краеведческого направления в туризме на примере изучения историко-культурных ценностей в Брестской области *Мигун Д.А..* 185
4.3. Концепт исторической памяти в подготовке специалистов в сфере туризма и гостеприимства *Панов С.В.* ..................................... 194
4.4. Организация въездного этнического туризма в УССР *Радченко О.Н.* ........................................................................................ 201
4.5. Першая сусветная вайна як аб’ект турыстычнай прываблівасці *Цуба М.В.*......................................................................................... 207
**Раздел 5. Психолого-педагогические аспекты развития образования в сфере туризма и гостиничного бизнеса** .................. 215
5.1. Иформационно-образовательная среда регионального университета в условиях построения институциональной модели организации 3.0 и системы подготовки специалистов в сфере туриндустрии и гостиничного бизнеса *Аксенчик Н.В.* ....................... 215
5.2. Специализированный модуль цикла социально-гуманитарных дисциплин в подготовке специалистов в сфере туризма и гостеприимства *Еленская И.Э.* ........................................................ 221
5.3. Компетентностный подход как средство взаимосвязи стандартов обслуживания, профессиональных и образовательных стандартов *Ивушкина Е.Б., Морозова Н.И.* ............ 227
5.4. Гістарычныя крыніцы ў навучанні гісторыі і гісторыка-краязнаўчай рабоце *Корзюк А.А.* ....................................................... 237
5.5. Социально-психологическая подготовка специалистов в сфере туризма и гостеприимства *Микелевич Е.Б.* ........................................ 245
**Заключение** .......................................................................................... 253
**Сведения об авторах** .......................................................................... 258